# У аб'ектыве-Гомельскі раён: адкрылася персанальная выстава фотамастака Андрэя Феактыстава

**Грабаўка, Баштан, Дзікалоўка, Старая Беліца, Урыцкае: гэтыя і іншыя населеныя пункты Гомельскага раёна сталі аб'ектамі для мастацкіх здымак фатографа Андрэя Феактыстава. У Гомельскім музеі друку і фатаграфіі адкрылася яго персанальная выстава, прысвечаная 95-годдзю Гомельскага раёна.**




Як адзначыла старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя Ладуцька, юбілейныя ўрачыстасці будуць праходзіць на працягу тыдня, і адкрывае іх унікальная выстава " Гомельскі раён. Мінулае. Сучаснае». Арганізацыйную і фінансавую падтрымку аказалі райсавет і райвыканкам, а таксама раённая

арганізацыя грамадскага аб’яднання “Белая Русь” і кіраўніцтва музея гісторыі Гомеля.

*— Выбраць фотаработы для экспазіцыі аказалася вельмі складана- Андрэй Феактыстаў сабраў велізарны архіў здымкаў на розныя тэмы, якія аб’ядноўвае адно — любоў да Гомельскага раёна, людзей, якія тут жывуць, беражлівыя адносіны да гісторыі краю і жаданне захаваць яго ўнікальнасць, — кажа Вікторыя Аляксандраўна. — Тым не менш, мы пастараліся выбраць сюжэты, якія найбольш ярка адлюстроўваюць шматграннасць таленту фотамастака.*






Усе, хто прыйшоў на выставу, змаглі дакрануцца да дзіўнаму свету Фотамастацтва: на здымках арганічна перапляліся мінулае і сучаснасць, прыгажосць прыроды і самабытнасць Гомельскага краю.

*— Нарадзіўся я ў Шлісельбургу, аднак дзяды і прадзеды мае родам з Грабаўкі — — распавёў Андрэй Феактыстаў. — Таму да гэтых месцаў у мяне асаблівае стаўленне, і большасць работ прысвечаны вёсцы і яе наваколлях.*




Тэматыка фотаработ Андрэя Феакцістава вельмі разнастайная, яму цікава паспрабаваць рэалізаваць незвычайныя праекты і правесці унікальныя здымкі, адзначыла Лілія Вялічка, галоўны рэдактар газеты «Нафтавік», якая на працягу 10 гадоў узначальвала «Маяк»:




— Андрэй, напэўна, адзіны ў вобласці фотамастак, які здымае дзікі жывёльны свет. Яго працы друкуюцца ў рэспубліканскіх выданнях, ён супрацоўнічае з пісьменнікамі і паэтамі, уступае з імі ў суаўтарства, ілюструючы іх выданні.







На адкрыццё выставы прыехалі жыхары Гомельскага раёна, якія з лёгкім хваляваннем шукалі здымкі сваіх населеных пунктаў або

землякоў. Некаторыя фатаграфіі майстра ўжо сталі вядомымі далёка за межамі раёна, напрыклад, “з марай аб небе” — здымак ветэрана Барыса Казлоўскіх з пасёлка Зябраўка з юным аднавяскоўцам.









У кожнага ёсць магчымасць убачыць свой родны край вачыма фотамастака: выстава будзе доўжыцца да 15 снежня.

Ірына Грамыка

https://sozhnews.by